ЧАС ПРАЎДЗІВЫХ НАВІН
№29 (552)
18 ЛІПЕНЯ 2013, ЧАЦВЕР
ганцавіцкі час
ВЫДАВЕЦ: ПВГУП «МЕДЫЯ-ГАНЦАВІЧЫ» | ПЕРЫЯДЫЧНАСЦЬ: 1 РАЗ У ТЫДЗЕНЬ
WWW.GANC-CHAS.BY

У НУМАРЫ

Уборачную на Ганцаўшчыне пачалі сярпамі



Каб ураджай выдаўся багатым, жнеі ўсцаўлялі «гаспадара» – старшыню СВК «Дубнякі» Уладзіміра Грыгарана, падкідаючы яго на «ўра».

Фота з архіваў раённага метадычнага цэнтра

5 СТАРОНКА

На Ганцаўшчыне будуць разводзіць ракаў

БІЗНЕС

Адзінагалосна прагаласавалі дэпутаты Ганцавіцкага раённага Савета дэпутатаў на пазачарговай сесіі, якая прайшла ў райвыканкаме ў аўторак, 16 ліпеня, за перадачу ў арэнду вадасховішча Бобрык і тэрыторыю каля яго агульнай плошчай 33,1 га, што знаходзіцца ва ўрочышчы Ясянёва ў 8-мі кіламетрах ад в. Раздзялавічы .



Заснавальнік ТАА «Спортфішынг» Мікалай Радчанка прадэманстраваў ракаў, якія водзяцца на вадасховішчах Лактышы і Бобрых. ФОТА: ПЁТР ГУЗАЕЎСКІ.

З просьбай арандаваць вадасховішча звярнулася прыватнае прадпрыемства "Спортфішынг", заснавальнікі якога плануюць займацца прамысловым вырошчваннем вузкапалага рака. Тэрмін арэнды прадастаўлены на 10 гадоў.

Адзін з заснавальнікаў ТАА (Таварыства з абмежаванай адказнасцю) "Спортфішынг" Мікалай Радчанка запэўніў дэпутатаў райсавета і прадстаўнікоў мясцовай улады з вёсак Раздзялавічы і Хатынічы, а таксама прысутных на сесіі прадстаўнікоў арганізацый і СМІ ў тым, што, перадаўшы вадасховішча ў арэнду, яны прынясуць карысць людзям, дзяржаве і іх прадпрыемству, якое збіраецца ад сваёй дзейнасці мець прыбытак.

"Хачу развеяць усе трывогі, якія могуць узнікаць ад недахопу інфармацыі, – сказаў Мікалай Радчанка, выступаючы на сесіі. – Людзі, пры гэтым не толькі жыхары бліжэйшых вёсак, але і ўсе, хто пажадае, свабодна і бясплатна могуць адпачываць, рыбачыць, лавіць ракаў без абмежаванняў пры ўмове захавання тых правілаў, якія прапісаны ў заканадаўстве. Хочаш лавіць ракаў – лаві на здароўе, але не больш чым трыма ракалоўкамі і не больш за 30 экзэмпляраў у суткі".

Староста вёскі Хатынічы Андрэй Ярашэвіч пацікавіўся, чаму ўзнікла ў прадпрымальніка ідэя ўзяць гэта вадасховішча у арэнду і з якой мэтай?"

Па словах Мікалая Мікалаевіча, на арэндуемым вадасховішчы яны хочуць разводзіць такіх ракаў, як і ў Лактышах, бо той рак, які зараз ёсць на вадаёме, нашмат драбнейшы, чым лактышоўскі.

"У Беларусі на рака попыт не вялікі, а велізарны, – сказаў бізнесмен. – Рака закупляюць гіпермаркеты, рэстараны, і ў Беларусі яго не хапае, імпартуюць з Арменіі".

Мікалай Радчанка расказаў, што ён ваенны пенсіянер і жыве ў Баранавічах, а ідэя зай-мацца развядзеннем ракаў ўзнікла, калі ён шукаў, дзе прымяніць свае сілы пасля таго, як пайшоў у адстаўку. "Я ўсё жыццё займаўся рыбнай лоўляй, дайвінгам, лавіў рака, ведаю яго павадкі і ўсё гэта мне блізка", – сказаў Мікалай Мікалаевіч.

(Працяг на 11-й стар.)

Воруют все, что «плохо лежит» и хорошо спрятано

КРИМИНАЛ

Неизвестного вора, который похитил у 63-летней пенсионерки Анны К., жительницы д. Раздяловичи велосипед, ищут сотрудники милиции, чтобы привлечь его к уголовной ответственности по ч. 1 ст. 205 УК РБ (кража).

Сельчанка обратилась в милицию 13 июля около 6-ти часов вечера и сообщила о том, что у нее в период времени с 22 часов 30 минут 12 июля до 07 часов 00 минут 13 июля из сарая похитил дорожный велосипед и причинил ущерб на сумму 1 миллион рублей.

Ганцевичским РОСК 13 июля по факту кражи возбуждено уголовное дело.

В понедельник, 8 июля, около 19 часов в дежурно-оперативную часть РОВД поступило сообщение Леонида В., жителя г. Барановичи, о том, что его брат Анатолий В. из дома отца по ул. Первомайской в д. Раздяловичи похитил два ножа, сапоги и велосипедную покрышку.

В тот же вечер в милицию позвонила Елена Ш., жительница г. Ганцевичи, и сообщила, что Василий П. и Наталья С. со двора ее дома похитили дорожный велосипед, принадлежащий ее сожителю.

В среду 10 июля около 18 часов вечера в милицию поступило сообщение Сергея К., ганцевчанина, проживающего по ул. Садовой, о том, что неустановленное лицо в период времени с 7 по 10 июля из его дома похитило бензопилу «Штиль». Милиционеры проводят проверку.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Потерпевший сам нашёл свой велосипед

КРАЖА

Чудесным образом пропавший велосипед жителя д. Чудин вернулся к своему хозяину.

Утром 11 июля в милицию поступило сообщение Вячеслава В., жителя д. Чудин, о том, что он обнаружил на весовой молочно-товарной фермы СПК «Будча» в д. Чудин свой велосипед, который пропал у него неделю назад. Каким образом пропавший транспорт «прикатил» на весовую, выясняет РОВД.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

За что били, непонятно

ХУЛИГАНСТВО

В том, что по ночам ходить по городу небезопасно, на собственном опыте убедился Владимир Р., на которого напали хулиганы.

В минувшее воскресенье, 14 июля, в 01 час 35 минут поступило сообщение ганцевчанина Владимира Р. о том, что возле кафе «Ностальгия» его пытались избить незнакомые граждане. В результате потасовки они порвали на нём рубашку и сломали наручные часы.

Что за «лихие парни» бродят у кафе по ночам, выясняют милиционеры.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Главврач заботится о питании пациентов

НАРУШЕНИЯ

Заботу о питании пациентов райбольницы на прошлой неделе проявил главный врач УЗ «Ганцевичская ЦРБ» Вадим Сошко.

В пятницу 12 июля в 14 часов 30 минут в оперативно-дежурную часть РОВД поступило сообщение Вадима Владимировича о проведении проверки по факту хищения продуктов работниками пищеблока УЗ «Ганцевичская ЦРБ» и по факту несоблюдения нормы выдачи порций.

Почему работники пищеблока урезали больным «пайку», теперь интересуются сотрудники милиции.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Ганцевчане пьют и скандалят

СЛУЖБА «102»

За истекшую неделю с 7 по 14 июля в оперативно-дежурную службу Ганцевичского РОВД поступило 78 сообщений, имеющих отношение к правоохранительной деятельности. Из них 21 сообщение касалось жителей района, которых привлекли к административной ответственности по ст.17.3 (нахождение в пьяном виде и распитие алкогольных напитков в общественном месте).

Пьяные лежали на земле, на автобусных остановках или в мелиоративной канаве, сидели у стен зданий и магазинов либо просто «шатались» по населенным пунктам. Вот несколько наиболее «ярких» сообщений.

В воскресенье в 10.00 часов утра председатель Чудинского сельсовета Анатолий Китик увидел у магазина по ул. Советской в д. Чудин толпу пьяных граждан, о чем сообщил в милицию. На «выпивох» был составлен протокол об административном правонарушении по ст. 17.3 ч. 1 КоАП Республики Беларусь.

Во вторник 9 июля около 10.30 минут в милицию поступило сообщение заместителя главврача УЗ «Ганцевичская ЦРБ» Виктора Аникевича о том, что на втором этаже поликлиники уснул пьяный мужчина. Его также привлекли к административной ответственности.

Среди пьяных нарушителей попадались и женщины. Так, 13 июля в 10.15 часов утра поступил рапорт инспектора ДПС ОГАИ Ганцевичского РОВД старшего лейтенанта милиции М. Лелеса, о том, что «в 09.30 часов жительница д. Раздяловичи Тамара И., находясь в пьяном виде на ул. Октябрьской в г. Ганцевичи, шаталась из стороны в сторону, в окружающей обстановке ориентировалась слабо, чем оскорбляла человеческое достоинство и нравственность». В отношении её составлен протокол об административном правонарушении по ст. 17.3 ч. 1; 18.23 ч.2 КоАП Республики Беларусь.

Не бывает дня, чтобы в милицию не поступило несколько сообщений о семейных или других скандалах. На прошедшей неделе правоохранители выезжали на 26 вызовов по данному поводу, причем 13 скандалистов доставили в РОВД и привлекли к административной ответственности за мелкое хулиганство (ст. 17.1 КоАП Республики Беларусь)

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Женщина попала в больницу с колото-резаной раной груди

ПРОИСШЕСТВИЯ

Тревожное сообщение о том, что в приемный покой УЗ «Ганцевичская ЦРБ» доставлена женщина с колото-резаной раной грудной клетки, поступило в милицию 10 июля в полпервого ночи.

Медсестра приёмного покоя В. Калиновская рассказала, что с такой травмой доставлена гражданка Евгения З..В данный момент сотрудники РОВД выясняют, кто нанес женщине эту травму. А сама потерпевшая находится на излечении в больнице.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Хварэць цяпер будзе нявыгадна

КАШАЛЁК

Значна спустошыць кашалькі беларусаў зацверджанае Саветам Міністрам Палажэнне аб новых правілах налічэння аплаты бальнічных лістоў, якое на днях пачало дзейнічаць.



Новае Палажэнне Саўміна робіць бальнічныя лісты больш таннымі. ФОТА АЎТАРА.

Усярэдненыя лічбы зарплат, на якія спасылаюцца і арыентуюцца чыноўнікі, не паказваюць сапраўднага становішча спраў у даходах насельніцтва. Пры гэтым тавары ды паслугі даражаюць часта (амаль штомесяц), хоць і патрохі, а зарплаты растуць рэдка і… таксама патрохі.

Новае рашэнне Саўміна не аблягчае становішча беларусаў, а, як кажуць, мацней зацягвае ім паясы. Мы паспрабавалі падлічыць, наколькі туга, разабраўшыся ў хітрасплеценнях новага дакумента.

Разгледзім некалькі стандартных сітуацый. Будзем зыходзіць з таго, што наш умоўны хворы чалавек атрымлівае сярэднямесячную зарплату 3 мільёны рублёў. Ён захварэў 16 ліпеня 2013 года і атрымаў бальнічны ліст на 10 дзён, да 23 ліпеня.

СІТУАЦЫЯ 1.

Калі чалавек працуе на рабочым месцы больш за 6 месяцаў.

Раней у такім выпадку сярэдні заробак за 1 дзень налічваўся, зыходзячы з зарплаты за апошнія 2 месяцы. Яго дзялілі на колькасць рабочых дзён. Першыя шэсць рабочых дзён "каштавалі" 80% сярэднядзённага заробку, а ўсе далейшыя – 100%.

У нашым выпадку сярэдні заробак за 1 дзень ліпеня-2013 складаў бы: 3 млн рублёў : 23 рабочыя дні = 130 тыс. рублёў. За першыя шэсць дзён хвораму работніку налічылі б: 104 тыс х 6 = 624 тыс. рублёў. За выхадныя ён бы не атрымаў нічога, а за наступныя 2 дні яму выплацілі б 130 тыс. х 2 = 260 тыс. рублёў. Такім чынам, за дзесяць дзён непрацаздольнасці чалавек **атрымаў бы 884 тысячы рублёў.**

Цяпер сярэдні заробак за 1 дзень будзе налічвацца, зыходзячы з зарплаты за 6 месяцаў. Дзеліцца яна ўжо не на рабочыя, а на каляндарныя дні. Першыя 12 дзён будуць аплачвацца па 80%, астатнія – па 100%.

У выніку, сярэднямесячны заробак за адзін дзень складзе: 3 000 000 руб. : на 31 каляндарны дзень = 96,8 тыс. рублёў. Усе дні хваробы палічаць па 80%, бо бальнічны менш за 12 дзён: 77,4 тыс. рублёў х 10 дзён = **774 тыс. рублёў.**

Думаю, каментары не патрэбны. Хіба толькі пра тое, што зарплата многіх жыхароў нашага раёна далёка не дацягвае нават да 3 мільёнаў рублёў…

СІТУАЦЫЯ 2.

Калі працоўны стаж чалавека складае менш за 6 месяцаў, лічы, яму зусім не пашанцавала. Бо сярэднядзённы заробак такога работніка будзе налічвацца не па зарплаце, а па бюджэце пражытачнага мінімуму (БПМ), пры гэтым – толькі па яго палове. З 1 мая па 31 ліпеня 2013-га БПМ у Беларусі складае 974 тыс. 110 рублёў, значыць, яго палова – 487 тысяч рублёў.

Калі **раней** сума аплаты бальнічнага ліста была б такой жа, як і ў першай сітуацыі, – **936 тыс рублёў**, то пасля навоўвядзення Саўміна яна значна здала свае пазіцыі. Лічым: 487 000 руб. : 31 дзень = 15,700 рублёў. Памнажаем атрыманы вынік на колькасць бальнічных дзён: 15,7 х 10. Атрымліваецца, што **цяпер** такі хворы атрымае ўсяго **157 тыс. рублёў.**

Нягуста, асабліва калі ўлічыць, што ў гэты перыяд будуць дадатковыя расходы: лякарствы каштуюць нятанна…

СІТУАЦЫЯ 3.

Калі чалавек атрымаў траўму ў стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення.

Раней яму выплацілі б палову сумы ад налічанай за звычайны бальнічны ліст на такі ж тэрмін – 10 дзён: 884 тыс : 2 = **442 тыс. рублёў.**

Цяпер за першыя шэсць дзён такі хворы грошай не атрымае ўвогуле. А вось астатнія дні аплацяць, як і раней – 50% ад належнага, або **309,6 тыс рублёў.**

Ці будуць такія меры садзейнічаць таму, каб людзі менш хварэлі? З гэтым пытаннем, а таксама з просьбай пракаменціраваць сітуацыю з бальнічнымі лістамі журналіст звярнулася да ўрача-педыятра са шматгадовым вопытам работы, які зараз знаходзіцца на заслужаным адпачынку, **Леаніда Фёдаравіча ДЫДЫШКІ**. Вось што ён адказаў:


– Людзі хварэць менш не будуць, а вось колькасць бальнічных лістоў паменшае. Такая эканомія у будучым выйдзе бокам і працаздольнаму насельніцтву, і краіне.

Самі падумайце: ці пойдзе, напрыклад, малады спецыяліст на бальнічны, калі ведае, што за час хваробы атрымае 150 тысяч рублёў замест васьмісот? Наўрад ці. Нават такую хваробу, як грып, хутчэй за ўсё, будзе стараццa "перахадзіць на нагах". А гэта небяспечна ўскладненнямі, у выніку якіх чалавек можа застацца інвалідам ці нават памерці. На мой погляд, налічэнне бальнічных лістоў па-новаму спрявакуе з'яўленне мноства розных хранічных захворванняў.

У іншых краінах ёсць прыклады больш цывілізаванага выйсця з сітуацыі. Напрыклад, чалавек захварэў, урач выдаў бальнічны як належыць, а вось прафсаюзная адміністрацыя павінна разгледзець, каму колькі плачваць: шчыраму працаўніку можна аплаціць і 100% бальнічнага, а лайдаку – зусім не плаціць.

А ўвогуле, мы сябе страхуем на час хваробы, калі плацім немалы працэнт ад заробку ў Фонд сацыяльнай абароны. Дык чаму ў нас забіраюць частку нашых жа грошай?!.

■ СВЯТЛАНА ЛОКТЫШ.



Стандартныя сітуацыі з налічэннем бальнічных – у лічбах.

ДАРЭЧЫ…

У Беларусі права на атрыманне бальнічнага ліста маюць работнікі, на якіх распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і за іх уплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы. Аплату бальнічных работнік атрымлівае ў дні выплаты зарплаты, а ў выніку працяглай хваробы (больш за месяц) яму можа быць выплачана частка дапамогі раней.

ГАНЦЕВЧАНЕ ОТВЕЧАЮТ

Как вы относитесь к заявлению премьер-министра М.Мясниковича о введении налога для неработающих?



Василий ПАШКЕВИЧ, пенсионер, житель д. Хотыничи:
– Положительно. Возможно, это заставит некоторых тунеядцев работать. Ведь у нас многие безработные только и делают, что выпивают или выпрашивают деньги, стоя у магазинов. В наше время все работали, я сам проработал 45 лет, поэтому не поддерживаю людей, которые тунеядствуют.



Любовь ШАМРИЛО, безработная, жительница д. Хотыничи:
– Я считаю, что это неправильно. Пусть сначала предоставят нормальную работу с достойным заработком, тогда и безработных не будет. Многие люди и рады бы работать, но работы не найти, даже в колхоз не устроиться. За что безработные должны платить, я не понимаю.



Алла ЖЕЛЕЗНАЯ, учитель СШ №1 г. Ганцевичи:
– Это не совсем правильно. В первую очередь нужно обеспечить людей работой с хорошей зарплатой, создать условия для сокращения безработицы. Тогда люди будут работать и платить налог. А какой налог могут заплатить безработные?



Алеся САЙКО, студентка Гродненского колледжа искусств:
– Я даже не знаю, как к этому относиться. Если человек не работает, откуда у него деньги? С другой стороны, надо как-то заставить безработных трудоустроиться. Я, например, еще учусь и уже работаю. В наше время без работы жить сложно, денег даром никто не даст.



Сергей Степанович КОСТЕЦКИЙ, пенсионер, житель д. Ганцевичи:
– Наверное, это правильно. Многие безработные у нас мнимые, на самом деле они работают за границей, в России или в иных странах. Государство должно заставить их платить налоги: они же пользуются всеми благами! Пусть за это платят.



Наталья ЛОКТЫШ, работник вспомогательной школы-интерната г. Ганцевичи:
– Поддерживаю инициативу. Работающие люди и с маленьких зарплат платят налоги. Безработные, которые ездят на заработки, привозят зарплаты, в несколько раз превышающие наши, и ничего не платят. Это нечестно. Тунеядцев и пьяниц тоже надо трудоустроить в колхозе – пусть зарабатывают и платят налоги.

■ ОПРОС ПРОВЕЛА СВЕТЛАНА МАЛЫШКО.



РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ «ГАНЦАВІЦКІ ЧАС» **ПЁТР ГУЗАЕЎСКІ**

Падатак на "паразітаў і тунеядцаў"

Нечаканай заявай здзівіў на мінулым тыдні прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч. На нарадзе з кіруючым актывам Магілёўскай вобласці ён заявіў пра неабходнасць увесці падатак з непрацуючых. А іх у Беларусі, па словах Мясніковіча, прыблізна 445 тысяч чалавек, і гэтыя людзі працаздольнага ўзросту не робяць ніякага ўнёску ў развіццё эканомікі.

Каб без работы яны не швэндаліся, прэм'ер-міністр прапанаваў: «*У кожным раёне неабходна штогод ствараць як мінімум дзесяць малых вытворчасцей. У нас шмат сваёй сыравіны, якую мы не выкарыстоўваем эфектыўна, а маглі б вырабляць, да прыкладу, будматэрыялы і інвентар, якія імпартуем. Тут вялікае поле дзейнасці*».

Каб гэта сказаў чалавек неадукаваны, то было б даравальна. А то заява прагучала з вуснаў прэм'ер-міністра, доктара навук...

Моцна сказаў, катэгарычна, па-дзяржаўнаму. Але ці не пустое гэта сатрасенне паветра? Бо калі ад слоў перайсці да практыкі, дык узнікае пытанне: а як гэта будзе рэалізавана?

Каб увесці падатак, патрэбна вызначыць падаткаабкладальную базу, іншымі словамі, з чаго будзе вылічвацца падатак. Быў некалі падатак, які ў народзе некаторыя называлі "халасцяцкі", альбо падатак "на яйцы". Дык гэта тычылася толькі працуючых. А як зараз?

Ад тых, што лічацца афіцыйна беспрацоўнымі, можна адабраць той мізер, які яны атрымліваюць. А як быць з тысячамі п'яніц, якія гадамі нідзе не працуюць, а перабіваюцца падачкамі і часовымі шабашкамі? Браць падатак пустымі бутэлькамі? Ці апошнія парваныя трусы ў іх адабраць? Ім жа ўсё адно, будуць іх штрафаваць, караць ці яшчэ што прыдумаюць.

Але дзякуючы прэм'ер-міністру даведаліся хоць, што лічба беспрацоўя у нас не супадае з афіцыйнай. Па дадзеных Міністэрства працы і сацабароны, зарэгістраванае беспрацоўе ў Беларусі трымаецца на ўзроўні 0,6% і на 1 красавіка 2013 г. складала 25,4 тыс. чалавек. Прэм'ер-міністр кажа пра каля 445 тысяч непрацуючых. А гэта больш за 10%, бо ў 2012 годзе было 4 млн 605 тыс. эканамічна актыўнага насельніцтва.

Магчыма, Міхаіл Уладзіміравіч не хоча адставаць ад прэзідэнта, які ездзіць па розных краінах і шукае грошы. Вось і ён знайшоў выйсце папоўніць казну. Увёў падатак – і ў бюджэт ракой пацякуць мільярды. Не рублёў, а долараў. Нават калі з кожнага з 445 тысяч "тунеядцаў" у месяц спагнаць па 10 тыс. рублёў, то за месяц сума будзе эквівалентнай амаль паўмільёну долараў. За год падаткі складуць каля 6 млрд долараў.

Калі ўсё ж нейкім чынам агучаную М. Мясніковічам прапанову пачнуць рэалізоўваць, то адразу патрэбна будзе вяртаць крымінальны артыкул за тунеядства, які існаваў пры Савецкім Саюзе. А ў 1961 годзе Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР нават прыняў указ «Пра ўзмацненне барацьбы з асобамі (лайдакамі, дармаедамі, паразітамі), якія ўхіляюцца ад грамадскакарыснай працы і вядуць антыграмадскі паразітычны лад жыцця». Указ абвясціў, што працаздольныя грамадзяне, якія не хочуць выконваць найважнейшы канстытуцыйны абавязак – сумленна працаваць, падвяргаюцца высяленню на тэрмін ад 2 да 5 гадоў з канфіскацыяй маёмасці і абавязковым прыцягненнем да працы па месцы пасялення.

Таму наступны крок павінен рэалізавацца ў будаўніцтве турмаў і калоній. Але ж на гэта таксама трэба грошы... Замкнёнае кола атрымліваецца. Так што прапанова Мясніковіча наўрад ці ажыццявіцца.

Вось калі падатак увесці для тых, хто фактычна працуе, але не плаціць у бюджэт ні капейкі, то гэта было б справядліва. Толькі зрабіць гэта трэба разумна, а не заганяць чалавека ў кабалу. Але гэта ўжо тэма наступнай калонкі маіх разважанняў, якая, я ўпэўнены, выкліча шмат эмоцый.



Если хлеб будет дорожать такими темпами, то на самом главном продукте придется экономить. ФОТО ЮЛИИ ПОЛЕССКОЙ

Ганцевичский хлебозавод первым повысил цены

ЭКОНОМИКА

С 9 июля Ганцевичский хлебозавод повысил отпускные цены на хлеб и хлебобулочные изделия на 3%, в магазинах в тот же день хлеб подорожал на 150 рублей. В Барановичском и Ляховичском районах цена на протяжении нескольких дней не повышалась.

Комментируя повышение цен, ведущий экономист, временно исполняющий обязанности директора Ганцевичского хлебозавода, Виктор Кохнович сначала сослался на Постановление Министерства экономики РБ от 4 июля 2013 г. № 48 «О внесении дополнения и изменения в Постановление Министерства экономики Республики Беларусь от 26 апреля 2012г. № 35». В данном документе установлены предельные максимальные отпускные цены по регулируемым группам хлеба. Это так называемый «социальный» хлеб, который в магазинах стоит дешевле. Наш хлебозавод такой вид хлеба не производит. По словам Виктора Сыктусевича, это убыточно для предприятия.

Возникает вопрос: если на Ганцевичском хлебозаводе такой хлеб не производят и на предприятие постановление Минэкономики №48 не распространяется, то почему повышение цен на нашем хлебозаводе обосновывают этим документом?

Мало того, что наши люди не имеют возможности покупать хлеб дешевле (его не только не производят на местном заводе, а вообще не завозят в наш район), так еще и цены на хлеб в нашем районе поднимают раньше, чем в других.

При повторном звонке в плановый отдел хлебозавода Виктор Кохнович сказал, что цены у них свободные. Поэтому в связи с подорожанием сырья (получен прейскурант цен на муку из Баранович) и разрешением облисполкома на повышение цен местные производители и подняли цены на хлеб. Но назвать конкретный документ, разрешающий сделать это, Виктор Сыктусевич в течение пяти дней так и не смог.

В ответ автор статьи не услышала названия документа, позволившего повысить цены на один из самых необходимых продуктов для человека и проанализировала тот факт, что в соседних районах хлеб реализовывали по старой цене в течение 5 дней после его подорожания в Ганцевичском районе. Поэтому закралось сомнение: правомерен ли этот рост цен? Звонок в управление антимонопольной и ценовой политики Брестского облисполкома расставил точки над "и", но опять же точного названия документа, разрешающего увеличить цену хлеба, там не назвали. Стало лишь понятно, что этот документ действительно существует и он позволяет повысить цены на хлеб по всей республике с 9 июля. В итоге, разбираясь со всей этой ситуацией, автор статьи пришла к выводу, что наш хлебозавод не отстает, а «идет в ногу со временем»: в отличие от других производителей хлеба, повышает цены сразу, не церемонясь… Хоть, по сути дела, какое может быть повышение цен на хлеб, если нового урожая зерна еще не было?..

Но, покупая хлеб, все равно можно сэкономить . В частных магазинах он стоит 5200 руб., в РайПО – 5400 руб., в киосках от хлебозавода – 4950 руб.

■ ЮЛИЯ ПОЛЕССКАЯ

Нормы вады на чалавека

ПЫТАЛІСЯ? АДКАЗВАЕМ...

ПЫТАННЕ **Раскажыце, калі ласка, якія нормы вады на чалавека ў прыватным сектары?**

Соф'я РАПЕЕВА, г. Ганцавічы.

АДКАЗ Амаль два гады назад уступіла ў сілу Пастанаўленне Савета Міністраў № 1300 "Аб унясенні змяненняў у пастанаўленне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 1999г. № 1332 і ад 4 лютага 2011 г. № 138". Згодна з гэтым дакументам, была ўведзена дыферэнцыраваная аплата за паслугі водазабеспячэння і водаадвядзення. Такім чынам, з 1 кастрычніка 2011 года ў Беларусі існуе норма вады на чалавека, за якую мы плацім па сацыяльных цэнах: 140 літраў у суткі або 4,2 кубаметра ў месяц у разліку на аднаго чалавека. Столькі ж вады, колькі чалавек выкарыстоўвае, лічаць камунальнікі, ідзе і ў каналізацыю. Цяпер мы плацім 900 рублёў за кубаметр вады і 550 рублёў – за адзін кубічны метр каналізацыі. Усяго – 1450 рублёў. Калі мы выкарыстоўваем ваду звыш ліміту, аплачваем яе па сабекошце. А гэта цяпер 4550 рублёў за кубаметр вады і 3350 рублёў за кубічны метр каналізацыі – усяго 7900 рублёў. Так што калі ў доме ёсць лічыльнікі, няцяжка падлічыць, колькі сям'я заплаціць у тым ці іншым месяцы. Варта толькі зняць паказанні прыбора. А вось уся вада, патрачаная жыхарамі кватэр і дамоў, дзе лічыльнікаў няма, аплачваецца па сабекошце, або па 7900 рублёў за кубаметр. Як сказала бухгалтар КУШВП ЖКГ "Ганцавіцкая РЖКГ" Наталля Бруй, нормы пры гэтым – адны для ўсіх: лічыцца, што адзін пражываючы выкарыстоўвае 240 літраў вады ў суткі або 8,3 кубаметра за месяц. *"Так што выгадней паставіць лічыльнік і плаціць толькі за тую ваду, якой карыстаемся",* – заўважыла Наталля Андрэеўна.

■ **СВЯТЛАНА ЛОКТЫШ.**

Зарабляючы на ягадах, можна пазбавіцца адраснай дапамогі

НА ЗАМЕТКУ

Шматлікія людзі, якія папаўняюць свой сямейны бюджэт "капейкай" ад продажу чарніц, нават не падазраюць, што могуць страціць больш, чым зарабіць.

Многія ганцаўчане амаль кожны дзень, як на працу, спраўна ходзяць у ягады, а потым сіне-фіялетавымі далонямі трымаюцца за спіну, намагаючыся прагнаць дакучлівы боль у паясніцы. Нягледзячы на цяжкую працу, аднак, пакуль яшчэ ніхто не стаў чарнічным баронам.

Як стала вядома супрацоўнікам "ГЧ", даход ад збору ягад улічваецца пры разліку сярэднедушавога даходу на чалавека пры аказанні адраснай дапамогі.

Па словах начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Наталлі Клявец, у сувязі з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 студзеня 2012 г. № 41 «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе» людзі пры запаўненні заявы на такую дапамогу абавязаны ўказваць усе свае даходы, у тым ліку атрыманыя ад збору чарніц. Калі сума ад продажу ягад дапоўніць суму даходаў на кожнага чалавека ў сям'і да пражытачнага мінімуму, то адрасная дапамога выдзелена не будзе. Калі ж чалавек скрыў свае даходы і адрасную дапамогу яму выдзелілі, а потым выяснілася, што сярэднедушавы даход у норме (былі ўлічаны атрыманыя ад продажу ягад грошы), то гэты чалавек будзе абавязаны вярнуць грошы. Наталля Ігнацьеўна сказала, што такія выпадкі ў мінулым годзе мелі месца.

Трэба заўважыць, што разнавіднасцю адраснай сацыяльнай дапамогі з'яўляюцца і сродкі, выдзеленыя для сілкавання дзяцей.

Ганцаўшчына багатая на чарніцы. І заробак у ягадах летам – гэта для многіх адзіная магчымасць папоўніць кашалёк. Летам, у час чарнічнага сезона, гарады і вёскі пусцеюць, бо часам цэлымі сем'ямі людзі ідуць і едуць у лес, каб "зарабіць хоць якую капейку".

З апытання стала вядома, што часцей за ўсё падлеткі збіраюць ягады, каб купіць за гэтыя грошы сучасныя тэлефоны і камп'ютары, бацькі стараюцца назапасіць за ягады прадукты на зіму або купіць дзецям адзенне ў школу. А жанчыны, якія ўжо на пенсіі, часцей за ўсё гаворацъ, што збіраюць ягады для таго, каб дапамагчы сваім дарослым дзецям і ўнукам. Ёсць і адваротны бок: не раз прыходзілася заўважаць, што ў ягады ідуць для таго, каб набраўшы іх і прадаўшы нарыхтоўшчыкам, узяць "дарослую" віна і што-небудзь "на зуб" – замест таго, каб назапасіць прадуктаў на зіму.

"А што мне, я нідзе не працую, зімой сяджу ды "лапу смакчу". Ні табе цыгарэту выкурыць, ні выпіць... А цяпер можна пагуляць..," – адказаў мужчына прадаўцу вясковага магазіна, якая спрабавала замест віна прадаць кліенту на выручаныя грошы за ягады макароны ды крупы.

Аўтар артыкула (калі сама збірала ягады) была сведкам таго, як маленькае дзіця, гадкоў шасці, было ў лесе разам з маці. Дзяўчынка хадзіла па высокім ягадніку, які быў ёй па пояс, з прывязанай баначкай з-пад ёгурта (у яе маленькая Марынка збірала чарніцы), а пасудзінай, у якую яна ссыпала сабраныя ягады, было вядзерца з-пад маянэзу. Па словах дзяўчынкі, пасля продажу ягад яна купіць сабе марожанае і цукеркі.

Трэба заўважыць, што ў ягады ідуць не ад добрага жыцця. А тут яшчэ такая сітуацыя з аказаннем сацыяльнай дапамогі. Такім чынам, выходзіць, што той, хто будзе цэлы дзень ляжаць на канапе, потым атрымае дапамогу дзяржавы, а той, хто не разгінае спіну ў лесе, атрымае адмоўны адказ у фінансавай падтрымцы?.

■ ЮЛІЯ ПАЛЕСКАЯ.

Раённыя "Зажынкі" далі старт уборачнай

УРАДЖАЙ-2013

Раённае свята "Зажынкі", якое прайшло ў мінулую пятніцу, 12 ліпеня, на полі СВК "Дубнякі", дало старт гарачай пары для хлебаробаў Ганцаўшчыны. Зажынкі праходзілі ў рамках раённага семінара аграномаў.



У час раённага свята хатыніцкія жнеі зажыналі першы сноп на кукаўскіх палях.
ФОТА З АРХІВАЎ РАЁННАГА МЕТАДЫЧНАГА ЦЭНТРА.

«Добры дзень ніўка, ядранае жыта!» – прывіталі карміцельку жнеі. І першы сноп быў зжаты ўручную, сярпамі, пад абрадавыя старажытныя песні і паклоны зямельцы-карміцельцы – як гэта рабілі нашы далёкія продкі сотні гадоў таму назад.

А распачалі важную справу носьбіты аўтэнтычных традыцый – удзельніцы фальклорнага гурта "Хатовічы" Хатыніцкага сельскага Дома культуры. Дапамагалі ім правесці народны абрад, які даў старт раённай уборачнай, самадзейныя артысты Кукаўскага СДК.

Першы сноп быў уручаны "гаспадару" раёна Уладзіміру Давыдчыку, які часова выконвае абавязкі старшыні райвыканкама, і "гаспадару" поля Уладзіміру Грыгарану, старшыні сельгаскааператыва "Дубнякі". Пасля У. Давыдчык, У. Грыгаран разам з начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама Юрыем Лелесам і механізатарамі адправіліся на камбайнах у поле, каб зрабіць першы намалот.

На ўскрайку поля засталіся чакаць хлебаробаў удзельнікі семінара і самадзейныя артысты. Апошнія з песнямі плялі вянкі з каласоў і палявых кветак. Гэтыя вянкі пазней упрыгожылі грудзі тых, каму выпаў гонар першымі намалаціць зерня. Яны ж першыя пачаставаліся караваем, які раздзялілі паміж усімі, хто прыйшоў у гэты дзень на свята.

Як расказала метадыст раённага метадычнага цэнтра аддзела ідэалогіі і культуры райвыканкама Ірына Марцінкевіч, сёлетнія "Зажынкі" раённага маштабу праводзіліся ўжо другі раз. Упершыню такое ж свята прайшло ў мінулым годзе ў вёсцы Крышылавічы, і яно таксама стала пачаткам уборачнай кампаніі ў раёне.

На наступны ж дзень пасля зажынак гаспадаркі раёна прыступілі да ўборкі зерневых і рапса. Хлебаробы імкнуцца як мага хутчэй сабраць з поля каштоўнае зерне – ці мала якое надвор'е прапануе нябесная канцылярыя! Ужо ў першыя ж дні вызначыліся лідары жніва-2013.

Па словах галоўнага агранома ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама Міхаіла Канановіча, сёлета на 17 ліпеня было ўбрана 37% рапса пры ўраджайнасці 20 цэнтнераў з гектара. На ўборцы рапса лідзіруюць СВК "Цельшына (убралі 70% ад пасеянага), "Дубнякі" (убрана 60%) і "Будча" (убраны 51%). Сельгаскааператывы "Дубнякі" і "Будча" нават ужо прадалі ААТ "Ганцавіцкі райаграсэрвіс" адпаведна па 128 і 144 тоны.

Вызначыліся на гэтую ж дату і лідары па ўборцы зерневых. З 33 га ўбралі зерне ААТ "Ганцавіцкі райаграсэрвіс", з 29 га – "Дубнякі", з 25 га – "Хатынічы", з 20 га – "Крышылавічы". Усяго хлеб сабраны з плошчы ў 107 га.

"Канечне, гэты год не самы лепшы для хлебаробаў. Кароткая вясна і дажджы пасадзейнічалі таму, што перыяд спеласці ў культур зрушыўся, стаў іншым. Да таго ж 1485 гектараў зерневых затапіла", – расказаў Міхаіл Кананoвіч.

Аднак хлебаробам асабліва няма калі перажываць па тым, што згублена, важна захаваць тое, што маем. Гаспадаркам раёна належыць убраць зерневых культур з плошчы ў 13070 га і рапса – з плошчы 2260 га. І старт уборачнай кампаніі дадзены…

■ СВЯТЛАНА ЛОКТЫШ.

ДАРЭЧЫ…

Зажынкі – старажытны абрад у гонар збору новага ўраджаю збожжа. Быў шырока распаўсюджаны ў славянскіх і іншых земляробчых народаў.

Зажынкі суправаджаліся адмысловымі зажыначнымі рытуаламі і песнямі, у якіх чуліся скаргі на цяжар працы і звароты да Бога з просьбай дапамагчы ўбраць ураджай, даць добрае надвор'е і здароўе.

Першы зажыначны сноп лічыўся імянінным. Яго ўпрыгожвалі кветкамі, неслі ў хату з песнямі і ставілі ў чырвоны кут пад абразы. З яго пачыналі ўвосень малацьбу, а саломай кармілі хворую скаціну. Збожжа першага снапа лічыліся гаючым для людзей і птушак.

Ребенок не хочет расставаться

СОВЕТЫ МАМЕ

Ребенок любит бабушку и дедушку, с удовольствием играет со сверстниками. Но как только приходится оставить его хоть ненадолго с родственниками или отправить в детский сад, все меняется. Малыш наотрез отказывается оставаться без родителей. Как вести себя в такой ситуации?

ЧТО ПРОИСХОДИТ?

Малыш пока не понимает, что у родителей есть дела, работа, ведь раньше они всегда были рядом. Ему еще предстоит научиться уважать личную жизнь мамы и папы, но сейчас это не всегда получается.

То, что взрослые считают «капризами», на самом деле – неумение управлять эмоциями. У малышей желание «я хочу, чтобы мама всегда была рядом!» – главное. Чувство одиночества, которое он испытывает при расставании, приводит к к слезам, истерикам.

ЧЕГО НЕЛЬЗЯ ДЕЛАТЬ?

Родители иногда сами провоцируют ребенка на «плохое» поведение. Прощание для детей – это не формальность, а целое событие, даже если происходит оно каждую неделю, а то и каждый день.

Уговоры не всегда действуют на малыша. Угрожать ни в коем случае нельзя. Даже если ребенок перестанет плакать после фразы: «Если сейчас же не успокоишься, уеду и больше вообще не приеду», в душе он будет чувствовать обиду, свою ненужность.

ИГРАЕМ ВМЕСТЕ!

Поначалу научите ребенка расставаться во время игр в прятки или «найди игрушку». Когда ребенок играет в песочнице, спрячьте при нем маленькую яркую игрушку в песок – пусть откопает ее. Разрешите ребенку поискать в карманах вашей одежды конфету, яркую игрушку, ключи. Так ребенок учится верить, что объекты (игрушки, вещи, люди) могут исчезать и возвращаться на свои места снова и снова, от этого они не портятся и не пропадают насовсем. Тогда ему будет проще объяснить, что мама не исчезнет, она уходит на время и скоро снова будет рядом.

РАССТАЕМСЯ С РИТУАЛОМ

Когда придет время расставания, посочувствуйте малышу, он вовсе не испытывает наши нервы на прочность, он просто сильно переживает. Посадите ребенка на колени или просто прижмите к себе, погладьте по голове. Выслушайте его. Ребенку важно сейчас выговориться, выплеснуть наружу беспокойство и тревогу. Скажите, что вы его очень любите и расстаетесь совсем ненадолго.

Можно придумать ритуал расставания. У каждого это будут свои слова и свои жесты, ведь только мама и папа могут найти самые нужные и важные слова.

И напоследок: стройте планы. Расскажите малышу, куда вы уходите и когда вы приедете снова. А когда вернетесь, привезите ребенку маленький подарок. Именно маленький (не пытайтесь купить ребенка!) – просто для того, чтобы малыш знал, что вы все время помнили о нем.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО с использованием материалов интернет-портала http://uspeh-centr.ru.

Здравствуй, мама, это я!



Семеро младенцев родились в Ганцевичском роддоме на прошедшей неделе, с 9 по 15 июля.

Во вторник, 9 июля, жительница д. Огаревичи Екатерина Горбач родила мальчика. В этот же день жительница д. Любашево Инна Мельникова родила девочку.

Спустя три дня, в пятницу 12 июля, две ганцевчанки – Наталья Подгайская и Диана Кабушко – родили дочерей.

В субботу, 13 июля, также две роженицы стали мамами. Жительница райцентра Юлия Мещерякова родила сына, а жительница д. Начь Нина Антонович родила дочь.

В воскресенье, 14 июля, ганцевчанка Лилия Заяц родила мальчика.

Поздравляем мам и их семьи с новорожденными!

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

На скрыжаванні праблем паменшала

ПА СЛЯДАХ ПУБЛІКАЦЫЙ

Два тыдні таму (№ 27 "ГЧ") ў артыкуле са змястоўнай назвай "Малое скрыжаванне з вялікімі праблемамі" расказвалася аб праблемах скрыжававання вуліц Калініна, Гойшыка і Някрасава, што ў райцэнтры. Сёння мы вяртаемся да ўзнятай тэмы, каб паглядзець, як адказныя асобы адрэагавалі на ўказаныя праблемы.



На месцы былога парыву – яма, у якую мясцовыя жыхары пачалі выносіць смецце

ФОТА: СВЯТЛАНА ЛОКТЫШ.

Адпраўлялася на скрыжаванне з надзеяй пазней напісаць цалкам хвалебны водзыў. Маўляў, так і так, службы раёна клапоцяцца пра сваіх людзей, названае скрыжаванне цяпер прыносіць ім не клопаты, а выключна радасць. Цалкам хваліць не атрымаецца. Але – зрухі ёсць, і значныя!

Камунальныя работнікі на скрыжаванні пабывалі. Яны ліквідавалі парывы водаправодных труб, і цяпер вада не разліваецца непрасыхальнымі лужынамі, не цячэ ў людскія агароды. Але на месцы парываў пакуль яшчэ стаяць калы са стужкамі, не засыпана яма.

Майстар участка вады і каналізацыі КУШВП ЖКГ "Ганцавіцкая РЖКГ" Леанід Кісялевіч на гэты раз не спасылаўся на звышзанятасць і патлумачыў, што дарогу пакуль выраўноўваць нельга. Варта паназіраць, як «будуць сябе паводзіць» парывы. Пры добрым раскладзе крыху пазней дарогу прывядуць у парадак.

Аднак цяпер хочацца кінуць каменне ў агарод жыхароў названых вуліц: навошта ў яму пачалі зносіць смецце?!.

Побач з былымі парывамі, а цяпер – з ямай са смеццем – знаходзіцца ўсё той жа калодзеж з адчыненым люкам, над якім сіратліва ўзвышаецца шына ад аўтамабільнага кола. Зазірнула ў сярэдзіну: з зялёнай стаячай вады тырчаць некалькі пустых бутэлек і трэсак – пэўна, дзеці правяралі на глыбіню. Праверыла і я: брудная вады там шмат. Не дай Бог зваліцца цікаўнаму дзіцяці!

Пэўна, нарэшце і камунальнікі зразумелі небяспеку. Як заверыў Леанід Трафімавіч, накрыўку для люка ўжо заказалі ў Мінску. Як толькі яна будзе выраблена, адразу ж зойме сваё месца.

Побач з меліярацыйнай канавай, да якой усё больш нахіляецца дарога, цяпер ляжыць куча ці то гравію, ці то каменьчыкаў. Пэўна, гэта і ёсць "агароджа", якая павінна ўтрымліваць зімой машыны ад таго, каб іх калёсы не саслізгнулі незнарок у гэтую канаву. Выходзіць, хоць і не надта клапаціўся пра эстэтыку, але абяцанне сваё намеснік начальніка КУШВП ЖКГ "Ганцавіцкая РЖКГ" Сяргей Вайцешык выканаў.

Здзіўлена адзначыла для сябе, што на працілеглым баку скрыжавання, каля дома інваліда 1-й групы Ніны Гатоўчыц дагэтуль буяе пустазелле. Патэлефанавала Ніне Дзмітрыеўне з пытаннем, ці не збіраецца ёй хто-небудзь дапамагчы скасіць пустазелле? *"Ох, мая міленькая, не толькі пустазелле, тут ужо цэлы лес, кусты разрасліся,* – пачула ў адказ. – *Я звязвалася ўчора са старшынёў гарсавета, Русакевічам Валерыям Мікалаевічам, паабяцаў, што сёння ўсё прывядуць у парадак. Але пакуль нікога не было".*

Да начальніка аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Валерыю Русакевічу не дазванілася. Але рабочы дзень пакуль яшчэ не скончаны – газета адпраўляецца ў тыпаграфію раней. Застаецца паспадзявацца, што абяцанне сваё Валерый Мікалаевіч выканае.

■ СВЯТЛАНА ЛОКТЫШ.

Рэкорд Універсіяды ад нашай зямлячкі

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Спартсменка-плаўчыха Аляксандра Герасіменя стала двухкратнай чэмпіёнкай і рэкардсменкай 27-й сусветнай летняй Універсіяды, якая прайшла ў Казані.



У момант перамогі цяжка стрымаць эмоцыі. ФОТА АЛЯКСАНДРА ВІЛЬФА, РІА НАВІНЫ.

Два залатыя медалі прынеслі нашай зямлячцы такі поспех. У мінулы чацвер, 11 ліпеня, Аляксандра перамагла на дыстанцыі 50 метраў батэрфляем з рэкордным для Універсіяды і для Беларусі вынікам 25,84 секунды. А ў пятніцу, 12 ліпеня, яна ўзышла на прыступку п'едэстала пасля таго, як пераадолела дыстанцыю 100 метраў вольным стылем за 53,50 секунды. Далёка ззаду за сабою ў першы дзень спаборніцтваў яна пакінула канадскую і італьянскую плаўчых, у другі дзень – расійскую і амерыканскую: яны занялі другія і трэція месцы.

Сёлетняе лета парадавала 27-гадовую Аляксандру яшчэ адной добрай падзеяй: яна атрымала дыплом Універсітэта народнай гаспадаркі па спецыяльнасці "менеджар-эканаміст". Раней Аляксандра скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры.

Цяпер беларуская "залатая рыбка" збіраецца адправіцца ў Оксфард, каб атрымаць трэцюю адукацыю і палепшыць свае веды па англійскай мове. Менавіта гэта прымусіла спартсменку прыняць рашэнне прапусціць чэмпіянат свету ў Барселоне. "Я была адабрана па нацыянальных нарматывах, але ў гэтым сезоне акцэнт мною быў зроблены на вучобу, некаторы час я не плавала і не была гатова паказваць свой максімум. Пасля Універсіяды адразу еду ў Оксфард, дзе трэба ўдзяліць час вывучэнню англійскай мовы," – сказала Аляксандра ў інтэрв'ю журналістам.

Дарэчы, Аляксандра ўдзельнічала ва Універсіядзе ўжо трэці раз. Першая з іх праходзіла ў Белгра-дзе ў 2009 годзе, другая– у Шэньчжэне ў 2011-м. Адтуль спартсменка прывезла 2 залатыя, 2 сярэбраныя і 2 бронзавыя ўзнагароды.

Нагадаем, што карані беларускай "залатой рыбкі" – у Будчы, адкуль родам яе тата Аляксандр Віктаравіч. Менавіта ў мясцовым вадаёме Аляксандра ўпершыню паплыла. Цяпер яна плавае ў лепшых басейнах свету, абараняе гонар усёй краіны і дзякуе бацькам за ўсё лепшае, што яны далі ёй. "Дзякуй тату за характар, дзякуй маме за вочы," – напісана на "сцяне" Аляксандры ў сацыяльнай сетцы "ВКонтакте".

■ СВЯТЛАНА ЛОКТЫШ.

Па матэрыялах "Інтэрфакса", сайта http://sport.tut.by/, http://kazan2013.rsport.ru/, http://www.belta.by/, http://vk.com/club31067426.

Самая крупная рыба за два дня чемпионата в Локтышах – 600-грамовый карась.

СПОРТИВНАЯ РЫБАЛКА

В нынешние выходные на водохранилище Локтыши прошел 2-й этап чемпионата Республики Беларусь по ловле рыбы спортивной поплавочной удочкой среди профессионалов. Он привлек не только рыболовов-спортсменов, которые приехали со всех уголков Беларуси, но и вызвал любопытство многих жителей района.

Испытать рыбацкую удачу и побороться за награды съехались 33 рыбака-профессионала. Ганцевичские рыболовы-любители сожалели, что нельзя им поучаствовать в соревнованиях. Хотя надежды победить профессионалов, которые ловили на импортного опарыша и приманивали локтышовскую рыбу дорогостоящей подкормкой, шансов было бы мало.

На Ганцевщине чемпионат Беларуси по спортивной ловле поплавочной удочкой проходил уже в третий раз. Нынешние соревнования запомнились участникам непредсказуемым поведением рыбы, которая то не клевала, то клевала очень хорошо, но зато или слишком близко к берегу, или уж очень далеко. Условия рыбалки на дамбе водохранилища Локтыши на этот раз были и с экстримом. Сильный ветер, обрушившийся на участников во время 2-го тура, разбросал удочки и поломал штекера участников соревнований. Спортсмены-рыбаки сетовали, что именно шторм мешает им забрасывать удочку, а тем самым выловить ту самую «золотую рыбку», которая привела бы к победе. В этой борьбе с погодой выигрывали короткие махи и штекера.

Порадоваться богатому улову в нынешнем году, в отличие от прошлого, было нечем. Ловилась в основном мелкая рыбка 30-50 г, плотва и густера, но временами подходил подлещик 100-200 г и ловился неплохо. Самой большой рыбой оказался карась 600 г, которого выловил рыбак с Молодечно Александр Самостроенко. А в минувшем году спортсмены смогли выловить несколько экземпляров больше 2 кг.

Когда пришло время подводить итоги и определять победителей, улов взвесили. Больше всех рыбы выловили и оказались на первом месте в командном зачете рыболовы из команды Matchfishing.by, на втором – рыбаки команды «Исток», третье место заняла команда Молодечненского района. Самыми удачливыми рыбаками в личном зачете стали: Андрей Герасимчук (1-е место), Павел Игнатович (2-е), Олег Закржевский (3-е). Победители состязаний награждены дипломами, медалями, призами.

Все победители ждут 3-го этапа соревнований, который пройдет в августе либо на Днепре в Речице, либо на Припяти около Пинска.

Рыбаки-профессионалы и в этот раз отметили с благодарностью высокий уровень сервиса и максимум комфорта, который им создают на Ганцевичской земле: территория обкошена, созданы прекрасные бытовые условия. К организаторам мероприятия были лишь пожелания допускать хотя бы вне зачета рыболовов-любителей. На сайте клуба ОО «Брик» в обсуждении чемпионата один из участников форума Алексей 707 задал вопрос: «Почему в последнее время все соревнования проводятся только среди спортсменов? На мой взгляд, из «не спортсменов» много классных рыбаков, многие из которых могли бы на равных посостязаться со спортсменами. И потом, нельзя забывать, что когда-то спортсмены были так же «не спортсменами»!».

Пока же «любителей» на соревнования не пускают, а отбирают лучших среди профессионалов: после третьего этапа определившиеся по итогам всех соревнований победители в свою очередь получают возможность поучаствовать в престижном чемпионате мира по спортивной ловле поплавочной удочкой.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Ганцевичское РЖКХ – серебряные призёры

СОРЕВНОВАНИЯ

Команда Ганцевичского РЖКХ заняла второе общекомандное место в зональных соревнованиях 16-й летней областной отраслевой спартакиады работников местной промышленности и коммунально-бытовой промышленности, которые состоялись 12 июля на стадионе СДЮШОР.

В соревнованиях участвовало 4 команды: Барановичское ГЖКХ, Ляховичское РЖКХ, Барановичское РЖКХ и Ганцевичское РЖКХ. Состязания проводились с целью отбора сильнейшей команды для участия в областных соревнованиях.

Наша команда завоевала много призовых мест. Два первых общекомандных места отвоевали команды женщин и мужчин, сразившись в игре по волейболу. На второе место команда вышла благодаря стараниям и меткости Владимира Распопова и Светланы Кононович. Участие в многоборье также увенчалось успехом благодаря упорной борьбе Руслана Покумейко, который в личном зачете занял 1-е место. Александр Радюк завоевал 2-е, Юлия Шуляк– 3-е, Оксана Чамарян – 4 место. В итоге Ганцевичское РЖКХ вышло на 2-е общекомандное место по многоборью.

«Если бы еще время для подготовки было, то можно было бы показать результаты лучше сегодняшних. А то вчера лежал под штангой, качая мышцы, а сегодня встал на беговую дорожку», – сказал Руслан Покумейко.


Абсолютный лидер атлетического многоборья Руслан Покумейко финиширует при поддержке Александра Радюка.. ФОТО АВТОРА

Запас маленьких побед после игры в мини-футбол и гиревого спорта пополнился третьим местом. Честь Ганцевичского РЖКХ в поднятии гири отстаивали Александр Дулик и Александр Кохнович.

■ ЮЛИЯ ПОЛЕССКАЯ

Сводный протокол соревнований

Команда	Волейбол (муж.)	Волейбол (жен.)	Мини-футбол	Гиревый спорт	Дартс	Л/а многоборье	Сумма мест	Место
Барановичское ГЖКХ	2	2	1	1	1	1	8	1
Ляховичское ЖКХ	4	3	2	2	3	3	17	3
Ганцевичское ЖКХ	**1**	**1**	**3**	**3**	**2**	**2**	**12**	**2**
Барановичское РЖКХ	3	4	4	4	4	4	23	4

Не работаешь? Плати!

НАЛОГИ

В Беларуси может быть введен налог для неработающих граждан. Такое мнение высказал на совещании с руководящим активом Могилевской области премьер-министр страны Михаил Мясникович, сообщили в пресс-службе белорусского правительства.

В Беларуси около 445 тыс. человек трудоспособного населения нигде не работают. Эти люди не вносят никакого вклада в развитие экономики и при этом пользуются социальными благами. *«Ситуацию нужно исправлять. Один из способов — введение налога с неработающих»,* — считает премьер-министр.

Михаил Мясникович отметил, что в регионах следует активизировать работу по созданию высокопродуктивных рабочих мест, чтобы вовлечь в экономику неактивное население, обеспечить достойной заработной платой.

«В каждом районе необходимо ежегодно создавать как минимум десять малых производств. У нас много своего сырья, которое мы не используем эффективно, а могли бы производить, к примеру, стройматериалы и инвентарь, которые импортируем. Здесь большое поле деятельности», — сказал премьер-министр.

■ ONLINER.BY

На возеры загінулі пяць чалавек

ЗДАРЭННІ

Жыткавіцкі раённы аддзел Следчага камітэта распачаў справу па ч. 2 арт. 316 Крымінальнага кодэкса (парушэнне правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі маламерных судоў асобай, якая кіравала суднам, што пацягнула па неасцярожнасці смерць чалавека) у дачыненні да 40-гадовага мужчыны.

14 ліпеня каля 14 гадзін падазраваемы, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, кіраваў маторнай лодкай «Прагрэс» на возеры Белае ў Жыткавіцкім раёне. У лодцы знаходзіліся дзевяць пасажыраў. Яшчэ адзін чалавек перавозіўся ў надзіманым балоне для катання.

Пры ажыццяўленні павароту лодачнік не справіўся з кіраваннем. Судна перакулілася і затанула.

Загінулі трое хлопчыкаў чатырох, пяці і сямі гадоў, маці старэйшага з іх, 1981 года нараджэння (усе жыхары Салігорска), і жыхарка Жыткавічаў, 1983 года нараджэння. Целы загінулых пасля доўгіх пошукаў дасталі з вады.

■ НАША НІВА

60% вакансій у Беларусі – заробак да 3 млн рублёў

ПРАЦА

Наймальнікі заявілі аб наяўнасці на 12 ліпеня 72,7 тыс. свабодных працоўных месцаў, з іх 70,4% — для рабочых, 29,6% — для спецыялістаў і служачых.

У агульнарэспубліканскім банку вакансій 14,2% працоўных месцаў — з заработнай платай Br 4 млн — 6 млн рублёў. У цэлым па краіне налічваецца 2,2% вакансій з заработнай платай Br 6 млн — 8 млн., 0,2% — Br 8 млн — 10 млн рублёў, а 0,1% вакансій пераадолелі мяжу ў 10 млн рублёў. Удзельная вага вакансій з заработнай платай Br 3 млн — 4 млн складае ў цэлым па Беларусі 22%, 2 млн — 3 млн — 32,1%, да 2 млн рублёў уключна — 29,2%.

■ NN.BY

Школьник оштрафован за мат в адрес учительницы

СОЦИУМ

Родители минского школьника оштрафованы, а сам он поставлен на учет за мат в адрес своей учительницы.

16-летний школьник, описывая свой конфликт с учительницей в социальной сети Twitter, использовал нецензурную лексику. Учительница написала заявление в милицию об оскорблении человеческого достоинства и нравственности. После проведенных разбирательств был составлен протокол. Комиссия по делам несовершеннолетних оштрафовала родителей школьника на 200 тыс. руб. Подросток поставлен на учет в инспекции по делам несовершеннолетних.

■ АФН

Мелкий бизнес: отсталый слой или могучий резерв экономики?

ФИНАНСЫ

Чиновники и некоторые близкие к властям аналитики восприняли недавний бунт малого бизнеса против техрегламента Таможенного союза как нежелание принимать справедливые требования и вписываться в цивилизованные рамки.



Поступления в бюджет Беларуси от малого бизнеса будут больше, если предпринимателям создать условия и не мешать работать. ФОТО С САЙТА S1.N1.BY.

В странах Западной Европы, США и Японии к малому бизнесу относятся предприятия, где работают не более 20 человек. Доля малого бизнеса в странах Евросоюза составляет порядка 60%, для экономики США — около 50%. В Беларуси вклад малого и среднего бизнеса в экономику существенно ниже — 22%. В странах-партнерах по Таможенному союзу — 20 и 19% в экономику России и Казахстана соответственно.

Государство должно перестать мучить бизнес проверками

Хотя доля индивидуальных предпринимателей среди категорий плательщиков в Беларуси пока незначительна, хотя объем налогов и сборов, которые они вносят в казну, постоянно растет. В Беларуси на протяжении ряда лет действует Программа государственной поддержки предпринимательства. Некоторые эксперты полагают, что в последние годы условия для ведения бизнеса в стране заметно улучшились. Однако до показателей развитых стран отечественному бизнесу еще далеко.

Какие реформы могут раскрыть потенциал малого и среднего предпринимательства в нашей стране?

Председатель Ассоциации малого и среднего бизнеса Сергей Балыкин уверен, что реформа нужна только одна — не мешать инициативе, оставить предпринимателей в покое. *«Важно не декларировать либерализацию, а просто не мешать бизнесу работать. Нужно перестать мучить проверками, отчетами»,*- сказал эксперт.

Бизнесу нужно давать ниши на рынке

